***М.Зарэцкі. “Ворагі”*** *(тэставае заданне, 10 клас)*

*1.Міхась Зарэцкі – гэта псеўданім пісьменніка. Яго сапраўднае імя:* 1) Мікалай Карлавіч Раманоўскі; 2) Міхась Яўхімавіч Касянкоў; 3) Яўген Іванавіч Скурко; 4) Язэп Паўлавіч Плашчынскі; 5) Іван Якаўлевіч Івашын.

*2.Апавяданне напісана ў:* 1) 1922 г.; 2) 1923 г.; 3) 1924 г.; 4) 1927 г.; 5) 1930 г.

*3.Памешчык Купрыянаў жыў:* 1) у вёсцы Мурагі; 2) у фальварку Смольгаў; 3) “вёрст за паўсотні адсюль” у маёнтку Купрыянава; 4) за 25 кіламетраў ад Бабруйска; 5) у фальварку Кавалькі.

*4.Паўлу Гуторскаму, калі ён пакахаў Ніну, было гадоў:* 1) 15; 2) 16; 3) 17; 4) 18; 5) 19.

*5.Гуторскі сустрэўся з Нінай пасля расстання праз:* 1) 5 гадоў; 2) 15 гадоў; 3) 8 гадоў; 4) 10 гадоў; 5) 3 гады.

*6.Васіля Купрыянава прысудзілі за сувязь з бандытамі:* 1) да ссылкі на 10 гадоў у Сібір; 2) расстрэлу; 3) пажыццёвага зняволення; 4) папраўчых работ тэрмінам на 15 гадоў; 5) вольнага пасялення ў Казахстане.

*7.Павел Гуторскі бацьку не наведваў:* 1) 3 гады; 2) 5 гадоў; 3) 7 гадоў; 4) 9 гадоў; 5) 12 гадоў.

*8.Ніна Купрыянава раней працавала:* 1) паштальёнам; 2) інжынерам; 3) рахункаводам; 4) настаўніцай; 5) доктарам.

*9.Напрыканцы апавядання аўтар параўноўвае Ніну:* 1) з лебедзем белым; 2) жар-птушкай; 3) восенню; 4) ланню; 5) сонцам у зеніце.

*10.Ніна Купрыянава:* 1) сімпатызуе Гуторскаму, адмаўляецца стаць жонкай “новага чалавека”; прываблівае Гуторскага “сваёй дзіўнай жаночай пекнатой”; 2) не лічыць сваіх бацькоў ворагамі, дачка былога памешчыка; чакае дзіця ад Зарубы, ворага рэвалюцыі, прызнаецца, што ён – “самае дарагое, даражэй за ўсё, мо даражэй за жыццё”; 3) “пажоўклы, адарваны ад дрэва лісток”, “адсклёпак старога ладу”; 4) ахвяруе сваім каханнем дзеля захавання жыцця бацькі; выхавана на традыцыях шляхетнасці, кіруецца ў жыцці пачуццём абавязку; 5) застаецца вернай каханаму; не належыць да апантаных рэвалюцыйных змагарак.

*11.Матрос у творы – гэта:* 1) чалавек, якога рэвалюцыйная рэчаіснасць яшчэ не да канца маральна дэфармавала; 2) старшыня сельсавета; 3) сусед Ніны Купрыянавай; 4) лепшы сябар і аднакласнік Паўла Гуторскага; 5) цвёрды бальшавік-чэкіст.

*12.Заруба ў апавяданні – гэта:* 1) у мінулым – афіцэр рускай арміі, цяпер – перакананы, непрымірымы вораг новай улады; 2) добры, спагадлівы да ўсіх, клапатлівы сын; муж, які любіць жонку і дзеля яе гатовы пайсці на ўсё; 3) каханы Ніны; 4) чалавек, ад якога Купрыянава чакае дзіця; 5) атаман банды, за якім палююць чэкісты на чале з Гуторскім.

*13.Павел Гуторскі ў творы:* 1) старшыня павятовай надзвычайнай камісіі, заблытаўся ў няпростых праблемах жыцця, “аб’інтэлігенціўся”, перакананы, што “правадыр не павінен далёка адыходзіць ад таго, каго ён вядзе”; 2) класава пільны і бескампрамісны; не вытрымаў выпрабавання на мужнасць, не здолеў ахвяраваць сабой дзеля каханага чалавека; 3) чалавек страснай натуры; у яго прысутнічае цвярозы разлік, не хоча трапіць у лагер ворагаў рэвалюцыі; 4) здольны на моцнае каханне і разуменне чужога болю; барацьбіт за пабудову новага жыцця; 5) для яго служба важней за ўсё астатняе; яго свядомасць сфарміравалася пад уплывам рэвалюцыйных лозунгаў; усведамляў, да чаго могуць прывесці яго далейшыя адносіны з Нінай.

*14.Хто ставіць такія пытанні ў апавяданні: “Хіба не можа пралетарый любіць буржуйку? Хіба яму можа хто ці што забараніць гэта? Хіба на каханне можна, як і на ўсё, глядзець выключна з класавага погляду?”* 1) Ніна Купрыянава; 2) Матрос; 3) Павел Гуторскі; 4) Загруцкі; 5) Заруба.

*15.Кульмінацыяй у творы з’яўляецца раздзел:* 1) VI; 2) VII; 3) VIII; 4) IX; 5) X.

*16.Асаблівасцямі апавядання з’яўляюцца:* 1) кульмінацыйны момант перадаецца праз дыялог і маналог; 2) глыбокі псіхалагізм, эмацыянальны фон; 3) аўтар адкрыта не выяўляе свае адносіны да апісаных падзей; 4) наяўнасць элементаў загадкавасці, займальнай інтрыгі, нечаканасць паваротаў дзеяння; 5) гераіня выпрабоўваецца сітуацыяй выбару.

*17.Размясціце пункты кампазіцыі (будовы) апавядання так, каб яны адпавядалі паслядоўнасці развіцця падзей у творы.*

(  ) 1) Ніна сказала Гуторскаму, што стаіць перад выбарам. Дзеля выратавання бацькі ёй неабходна ахвяраваць найдаражэйшым у жыцці.

(  ) 2) Гуторскі ўспомніў Ніну Купрыянаву. Ён вырашае паехаць да Купрыянава, каб разабрацца ў яго контррэвалюцыйнай агітацыі і сувязі з бандай Зарубы.

(  ) 3) Гуторскі прызнаўся Ніне ў каханні і прапанаваў стаць яго жонкай. Тая сказала, што не кахае яго, дала адмоўны адказ.

(  ) 4) Дзверы Гуторскаму адчыніла Ніна. Яна не пазнала яго, паводзіла сябе непрыхільна.

(  ) 5) Гуторскі з Матросам абмеркавалі план захопу банды Зарубы. Яны дамовіліся вечарам сустрэцца на кватэры.

**Заданні С *(дайце поўныя адказы на пытанні)***

*1.Сюжэтны “каркас” апавядання трымаецца на класічным трохкутніку. Запішыце яго.* __________

______________________________________________________________________________

*2.На пытанне Ніны, што Павел Гуторскі выбраў бы: “або страціць бацьку, або адмовіцца ад вашае справы”, ён адказвае:* ____________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

*3.З якой мэтай Павел Гуторскі едзе на новае месца – у “Чырвоную Армію, у яе гушчыню”?* ________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

*4.Якія праблемы вырашае аўтар у апавяданні?* ________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

______________________________________________________________________________

***М.Зарэцкі. “Ворагі”*** *(тэставае заданне, 10 клас)*

*1.Міхась Зарэцкі – гэта псеўданім пісьменніка. Яго сапраўднае імя:* 1) Мікалай Карлавіч Раманоўскі; **2)** Міхась Яўхімавіч Касянкоў; 3) Яўген Іванавіч Скурко; 4) Язэп Паўлавіч Плашчынскі; 5) Іван Якаўлевіч Івашын.

*2.Апавяданне напісана ў:* **1)** 1922 г.; 2) 1923 г.; 3) 1924 г.; 4) 1927 г.; 5) 1930 г.

*3.Памешчык Купрыянаў жыў:* 1) у вёсцы Мурагі; 2) у фальварку Смольгаў; **3)** “вёрст за паўсотні адсюль” у маёнтку Купрыянава; 4) за 25 кіламетраў ад Бабруйска; 5) у фальварку Кавалькі.

*4.Паўлу Гуторскаму, калі ён пакахаў Ніну, было гадоў:* 1) 15; **2)** 16; 3) 17; 4) 18; 5) 19.

*5.Гуторскі сустрэўся з Нінай пасля расстання праз:* 1) 5 гадоў; 2) 15 гадоў; 3) 8 гадоў; **4)** 10 гадоў; 5) 3 гады.

*6.Васіля Купрыянава прысудзілі за сувязь з бандытамі:* 1) да ссылкі на 10 гадоў у Сібір; **2)** расстрэлу; 3) пажыццёвага зняволення; 4) папраўчых работ тэрмінам на 15 гадоў; 5) вольнага пасялення ў Казахстане.

*7.Павел Гуторскі бацьку не наведваў:* 1) 3 гады; **2)** 5 гадоў; 3) 7 гадоў; 4) 9 гадоў; 5) 12 гадоў.

*8.Ніна Купрыянава раней працавала:* 1) паштальёнам; 2) інжынерам; 3) рахункаводам; **4)** настаўніцай; 5) доктарам.

*9.Напрыканцы апавядання аўтар параўноўвае Ніну:* 1) з лебедзем белым; 2) жар-птушкай; **3)** восенню; 4) ланню; 5) сонцам у зеніце.

*10.Ніна Купрыянава:* **1)** сімпатызуе Гуторскаму, адмаўляецца стаць жонкай “новага чалавека”; прываблівае Гуторскага “сваёй дзіўнай жаночай пекнатой”; **2)** не лічыць сваіх бацькоў ворагамі, дачка былога памешчыка; чакае дзіця ад Зарубы, ворага рэвалюцыі, прызнаецца, што ён – “самае дарагое, даражэй за ўсё, мо даражэй за жыццё”; **3)** “пажоўклы, адарваны ад дрэва лісток”, “адсклёпак старога ладу”; **4)** ахвяруе сваім каханнем дзеля захавання жыцця бацькі; выхавана на традыцыях шляхетнасці, кіруецца ў жыцці пачуццём абавязку; **5)** застаецца вернай каханаму; не належыць да апантаных рэвалюцыйных змагарак.

*11.Матрос у творы – гэта:* **1)** чалавек, якога рэвалюцыйная рэчаіснасць яшчэ не да канца маральна дэфармавала; 2) старшыня сельсавета; 3) сусед Ніны Купрыянавай; 4) лепшы сябар і аднакласнік Паўла Гуторскага; **5)** цвёрды бальшавік-чэкіст.

*12.Заруба ў апавяданні – гэта:* **1)** у мінулым – афіцэр рускай арміі, цяпер – перакананы, непрымірымы вораг новай улады; 2) добры, спагадлівы да ўсіх, клапатлівы сын; муж, які любіць жонку і дзеля яе гатовы пайсці на ўсё; **3)** каханы Ніны; **4)** чалавек, ад якога Купрыянава чакае дзіця; **5)** атаман банды, за якім палююць чэкісты на чале з Гуторскім.

*13.Павел Гуторскі ў творы:* **1)** старшыня павятовай надзвычайнай камісіі, заблытаўся ў няпростых праблемах жыцця, “аб’інтэлігенціўся”, перакананы, што “правадыр не павінен далёка адыходзіць ад таго, каго ён вядзе”; **2)** класава пільны і бескампрамісны; не вытрымаў выпрабавання на мужнасць, не здолеў ахвяраваць сабой дзеля каханага чалавека; **3)** чалавек страснай натуры; у яго прысутнічае цвярозы разлік, не хоча трапіць у лагер ворагаў рэвалюцыі; **4)** здольны на моцнае каханне і разуменне чужога болю; барацьбіт за пабудову новага жыцця; **5)** для яго служба важней за ўсё астатняе; яго свядомасць сфарміравалася пад уплывам рэвалюцыйных лозунгаў; усведамляў, да чаго могуць прывесці яго далейшыя адносіны з Нінай.

*14.Хто ставіць такія пытанні ў апавяданні: “Хіба не можа пралетарый любіць буржуйку? Хіба яму можа хто ці што забараніць гэта? Хіба на каханне можна, як і на ўсё, глядзець выключна з класавага погляду?”* 1) Ніна Купрыянава; 2) Матрос; **3)** Павел Гуторскі; 4) Загруцкі; 5) Заруба.

*15.Кульмінацыяй у творы з’яўляецца раздзел:* 1) VI; **2)** VII; 3) VIII; 4) IX; 5) X.

*16.Асаблівасцямі апавядання з’яўляюцца:* **1)** кульмінацыйны момант перадаецца праз дыялог і маналог; **2)** глыбокі псіхалагізм, эмацыянальны фон; **3)** аўтар адкрыта не выяўляе свае адносіны да апісаных падзей; **4)** наяўнасць элементаў загадкавасці, займальнай інтрыгі, нечаканасць паваротаў дзеяння; **5)** гераіня выпрабоўваецца сітуацыяй выбару.

*17.Размясціце пункты кампазіцыі (будовы) апавядання так, каб яны адпавядалі паслядоўнасці развіцця падзей у творы.*

(4) 1) Ніна сказала Гуторскаму, што стаіць перад выбарам. Дзеля выратавання бацькі ёй неабходна ахвяраваць найдаражэйшым у жыцці.

(1) 2) Гуторскі ўспомніў Ніну Купрыянаву. Ён вырашае паехаць да Купрыянава, каб разабрацца ў яго контррэвалюцыйнай агітацыі і сувязі з бандай Зарубы.

(5) 3) Гуторскі прызнаўся Ніне ў каханні і прапанаваў стаць яго жонкай. Тая сказала, што не кахае яго, дала адмоўны адказ.

(2) 4) Дзверы Гуторскаму адчыніла Ніна. Яна не пазнала яго, паводзіла сябе непрыхільна.

(3) 5) Гуторскі з Матросам абмеркавалі план захопу банды Зарубы. Яны дамовіліся вечарам сустрэцца на кватэры.

**Заданні С** ***(дайце поўныя адказы на пытанні)***

*1.Сюжэтны “каркас” апавядання трымаецца на класічным трохкутніку. Запішыце яго.*

**Ніна Купрыянава – Заруба – Павел Гуторскі**

*2.На пытанне Ніны, што Павел Гуторскі выбраў бы: “або страціць бацьку, або адмовіцца ад вашае справы”, ён адказвае,* **што ўжо шмат гадоў не бачыўся з бацькамі. “І калі й было ва мне якое сыновае пачуццё, дык цяпер яго няма й звання… Я б, вядома, не задумаўся…”**

*3.З якой мэтай Павел Гуторскі едзе на новае месца – у “Чырвоную Армію, у яе гушчыню”?*

**Павел Гуторскі “схамянуўся, рашыў лячыцца, пакуль не позна, ад сваёй хваробы. Рашыў вярнуцца, зліцца з працоўным народам, набрацца сіл жыватворных, замацаваць свае права на новае жыццё… Там ён набярэцца сіл, узновіць парваную сувязь, зноў пусціць карані. Там ён зноў стане здаровы!” Гуторскі верыць, што ў новым жыцці “не будзе гэтых адсклёпкаў, гэтых пажоўклых лістоў старога, гнілога, забуранага навальніцай дрэва”.**

*4.Якія праблемы вырашае аўтар у апавяданні?* **Узаемаадносіны грамадскага і асабістага, “ворагаў”, так званых былых ва ўмовах класавай барацьбы і ідэалагічнага супрацьстаяння.**